# Культуралогія — новая навуковая дысцыпліна ў Беларусі

**Л.К.Кухто**
*(Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў)*

***Фенаменальнай з'явай айчыннай культуры можна па праву назваць выданне 18-томнай «Беларускай энцыклапедыі». Значная частка апошняга тома адведзена гісторыі станаўлення і развіцця беларускай навукі. Асноўнай тэндэнцыяй развіцця грамадскай думкі на сучасным этапе з'яўляецца пошук новых падыходаў, светапоглядных арыентацый і праграм у розных сферах жыццядзейнасці людзей. Адным з прыярытэтных накірункаў навукова-даследчай дзейнасці стала вывучэнне нацыянальных традыцый і культуры, узаемадзеяння запытаў асобы з сацыякультурным асяроддзем і сістэмай выхавання. У выніку такой дзейнасці ў Беларусі пачала складвацца новая галіна гуманітарных ведаў — культуралогія, што і адлюстравана ў энцыклапедыі.***

Упершыню за ўсю гісторыю развіцця айчыннай навукі культуралогія вылучана як новая навуковая дысцыпліна. У артыкуле, аўтарам якога з'яўляецца доктар культуралогіі А.І.Смолік, паказана гісторыя станаўлення беларускай навукі аб культуры. Нягледзячы на тое, што першыя працы культуралагічнага характару з'явіліся ў Беларусі ў эпоху Адраджэння, да канца XX стагоддзя культуралогіі як навуковай і вучэбнай дысцыпліны не існавала.

У той жа час у еўрапейскіх краінах, пачынаючы з 50-ых гадоў XIX стагоддзя, адбываліся назапашанне ведаў, фарміраванне ўяўленняў аб прадмеце і межах гэтай пазнавальнай сферы, крышталізацыя зыходных асноў і ключавых катэгорый. Таму навука аб культуры як галіна сацыяльна-навуковага пазнання там хутка развівалася. Праўда, яна мела некалькі сінанімічных назваў: культурная антрапалогія, сацыяльная антрапалогія, этналогія. Нягледзячы на гэтыя адрозненні ў назвах, размова ішла пра вывучэнне штучнага, непрыроднага свету чалавека, завучаных паводзін.

На працягу XX стагоддзя ў Еўропе ў межах культурнай (сацыяльнай) антрапалогіі (або этналогіі) сканцэнтраваўся вялікі эмпірычны і тэарэтычны матэрыял, прычым не толькі дзякуючы навуковаму пераасэнсаванню гістарычных даных. Асноўнымі крыніцамі сістэматычнай інфармацыі аб культурных феноменах сталі вынікі шматлікіх даследаванняў, вывучэння сэнсаў і значэнняў культурных аб'ектаў, матываў актыўнасці, якія ўплываюць на падтрыманне або змяненне элементаў штучнага свету. І калі ў першай палове XX стагоддзя такія даследаванні мелі акадэмічны характар і шмат у чым вызначаліся імкненнем утрымаць інфармацыю пра адыходзячыя ў мінулае прымітыўныя культуры, то ў другой палове стала відавочнай прагматычная каштоўнасць ведаў пра вытокі, фактары, механізмы, якія абумоўліваюць існаванне агульнага і спецыфічнага, устойлівага і зменлівага ў любой культуры. Такога кшталту веды пачалі эфектыўна ўжывацца ў сферах масавай камунікацыі, бізнесу, сацыякультурнай адаптацыі, у дзейнасці транснацыянальных карпарацый, дыпламатыі.

Трэба адзначыць, што і ў Беларусі ў дасавецкі перыяд пазнанне культуры па якасці і формах амаль што дасягала сусветнага ўзроўню. У бібліятэках і архівах захоўваецца неасвоеная спадчына айчынных аўтараў, якія звярталі ўвагу непасрэдна на вывучэнне культуры, прычым на ўзроўні не толькі філасофскага, але і пазітыўнага ведання. Сярод даследчыкаў таго часу трэба вылучыць І.Абдзіраловіча, М.Багдановіча, Л.Бароўскага, М.Нікіфароўскага, І.Сербава, Ю.Крачкоўскага, П.Шэйна, М.Каспяровіча, М.Федароўскага, Я.Тышкевіча, А.Цвікевіча і іншых. Яны

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

на падставе глыбокага комплекснага параўнальна-гістарычнага абагульнення фактычнага матэрыялу абгрунтавалі нацыянальную самабытнасць беларусаў як самастойнага славянскага народа, які стварыў сваю багатую і арыгінальную культуру. Моцным быў і эмпірычны напрамак: разам з прафесійнай этнаграфіяй шырока распаўсюджваўся краязнаўчы рух, які ініцыіраваўся і падтрымліваўся адукаванымі дылетантамі.

У савецкі перыяд гэты працэс быў на доўгія дзесяцігоддзі спынены. Толькі з сярэдзіны 80-ых гадоў XX стагоддзя ў Беларусі пачынаецца плюралізацыя ўяўленняў аб існуючых у сусветнай навуцы мадэлях і тэорыях, якія адносяцца да сацыякультурнага жыцця. Напачатку рабіліся спробы прыстасаваць да гэтых мадэлей марксісцкі паняційны апарат, пазней жа катэгорыі і паняцці з розных накірункаў заходніх сацыяльных навук і філасофіі сталі ўжо існаваць самастойна.

У гэты час выразна назіраюцца дзве асноўныя тэндэнцыі ў дынаміцы сацыяльна-навуковага пазнання, і ў прыватнасці ў вывучэнні культуры. Працягваюць існаваць мадэлі пазнання культуры ў сферах філасофіі, філалогіі, археалогіі, гісторыі, якія склаліся на папярэднім этапе. Тут адбываецца назапашанне эмпірычных ведаў і фактаў, якія ўсё больш перастаюць укладацца ў простыя ідэалагічныя формы інтэрпрэтацыі. У той жа час узмацняецца дыфузія ведаў аб грамадстве і культуры, якія ўжо ёсць у заходніх краінах. Усё гэта выклікала неабходнасць пераходу ад міфічнага да больш рацыянальнага асэнсавання культурных працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве. На той момант у беларускай гуманітарыстыцы ўжо існавала вялікае сінкрэтычнае пазнавальнае поле, дзе адначасова суіснавалі мноства ўяўленняў аб культуры, фрагменты разнапланавых тэорый, разнаякасных катэгорый. Грамадазнаўцам трэба было дыферэнцыраваць і ўпарадкаваць гэту сінкрэтычную сумесь.

Такім чынам, у канцы 80-ых гадоў у Беларусі сфарміраваўся сацыяльны запыт на дакладныя навуковыя веды аб культуры. Аднак істотнае адставанне нашых сацыяльных навук ад сусветнага ўзроўню прывяло да таго, што толькі асобныя вучоныя маглі выразна адказаць на сацыяльна значныя пытанні аб крыніцах напружання ў грамадстве і парушэннях сацыякультурнай ідэнтычнасці. У гэты перыяд выдаюцца культуралагічныя працы Я.М.Бабосава, Э.К.Дарашэвіча, У.М.Конана, М.І.Крукоўскага, В.І.Русецкай, В.У.Пазнякова, І.Я.Шыршова. У іх разглядаюцца праблемы развіцця беларускай нацыі, сацыядынаміка культуры ў яе нацыянальных традыцыях і асаблівасцях у кантэксце ўзаемадзеяння са станаўленнем і з праяўленнямі спецыфічна беларускага менталітэту, нацыянальнай своеасаблівасці і самасвядомасці беларускага народа як у мінулыя эпохі, так і ў сучасны перыяд.

У 90-ыя гады XX стагоддзя цікавасць да вывучэння культуры істотна ўзрасла. Вучоныя сусветнай супольнасці спрабуюць адказаць на пытанне: чым з'яўляецца гістарычны шлях чалавецтва — паслядоўным развіццём па нейкай абавязковай для ўсіх лінейнай схеме ці ўзаемадзеяннем розных тыпаў культур-цывілізацый? З такім аспектам аналізу цесна звязаны праблемы ўдасканалення культур, распрацоўкі мадэлей будучага развіцця і ўплыву чалавека на ход гісторыка-культурнага працэсу. Культуралагічная адукацыя прызначана рыхтаваць моладзь да арыентацыі ў сучасным свеце, асэнсавання яго як сукупнасці культурных дасягненняў чалавецтва, спрыяць разуменню і прадукцыйным зносінам прадстаўнікоў розных культур. Таму ў навукова-даследчых і вышэйшых навучальных установах Беларусі ствараюцца кафедры культуралогіі, у вучэбны працэс уводзіцца культуралагічны курс.

Аднак культуралагічная праблематыка патрабуе абнаўлення метадалогіі даследавання, выкарыстання розных падыходаў да вывучэння культур. У сувязі з гэтым у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы, Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы адкрываюцца аспірантуры па тэорыі і гісторыі культуры, ствараюцца саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Маладыя даследчыкі вывучаюць заканамернасці развіцця і функцыянавання культуры, яе структуру і дынаміку, узаемасувязі і ўзаемадзеянні з іншымі сферамі матэрыяльнага і духоўнага жыцця. Да ліку самых важных праблем



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

культуралогіі адносіцца даследаванне пытанняў гісторыі і тэорыі сусветнай і айчыннай культуры. На мяжы стагоддзяў беларускімі вучонымі былі падрыхтаваны і выдадзены манаграфіі, прысвечаныя ролі духоўнай культуры ў рэгуляцыі розных сфер сацыяльнага быцця ва ўмовах сістэмнай трансфармацыі грамадства, дзейнасці сацыякультурных інстытутаў, якія забяспечваюць функцыянаванне культуры: «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме» А.І.Смоліка (1999); «Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію» М.І.Крукоўскага (2001); «Этнічныя асновы культуры» П.Р.Ігнатовіча і Ю.В.Чарняўскай (2001) і інш. Новым кірункам у культуралогіі стала архітэктурная герменеўтыка. Гэта працы І.В.Марозава «Таямнічай дарогай Гермеса» (1994); «Архітэктурная герменеўтыка» (1999). Вывучэнню сутнасных праяўленняў прыгажосці, што дэтэрмінуюць развіццё культуры, прысвечаны працы У.Ф.Мартынава «Філасофія прыгажосці» (1999) і «Эстэтыка» (2004).

Маладымі беларускімі культуролагамі І.У.Вараб'ёвай, С.У.Данскіх, Т.І.Якавук, С.Л.Вілейка, А.А.Касперуком, В.В.Калацэем, Л.С.Кажухоўскай, Т.В.Карнажыцкай, І.Л.Коганам, Ю.Г.Болатавай, Э.А.Усоўскай, Т.Ф.Сухоцкай, І.М.Шумскай завершаны даследаванні дынамікі і базавых кампанентаў каштоўнасных арыентацый асобы ва ўмовах трансфармацыі сацыякультурнага асяроддзя; станаўлення і развіцця кніжнай культуры як неад'емнай часткі нацыянальнай культуры; аксіялагічных і структурных асноў мастацкай культуры; пытанняў генезісу; тыпалогіі і механізмаў самазахавання нематэрыяльнай традыцыйнай культуры; ролі і месца ў структуры культурнага арганізма этыкі і рэлігіі, іх узаемаадносін як сэнсаўтваральнага прынцыпу аблічча і стылю культуры; механізмаў сацыякультурнай рэгуляцыі дэмаграфічных паводзін суб'ектаў посткатастрофнага соцыуму; тыпаў і формаў утопіі ў беларускай культуры, культурнай палітыкі ва ўмовах сістэмнай трансфармацыі грамадства.

Да цяперашняга часу ў Беларусі аформіліся навуковыя цэнтры, якія спрабуюць асэнсаваць сацыяльна-культурныя рэаліі XXI стагоддзя, тэарэтычныя праблемы культуры: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Беларускі інстытут праблем культуры, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы. Сучаснымі культуралагічнымі даследаваннямі займаюцца таксама вучоныя Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы, Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа, Інстытута літаратуры імя Я.Купалы, Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі і інш.

Аналіз стану сучасных культуралагічных даследаванняў дазваляе канстатаваць, што напачатку XXI стагоддзя ў Беларусі сфарміравалася абагульненая навука аб культуры, якая надае стройнасць і завершанасць культуразнаўству. Культуралогія як комплексная гуманітарная навука развіваецца на сумежжы гісторыі, філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі, антрапалогіі, этналогіі, мастацтвазнаўства, семіётыкі, лінгвістыкі, інфарматыкі, сінтэзуючы і сістэматызуючы даныя гэтых навук. Структура культуралогіі, яе метады, дачыненне да тых ці іншых галін навуковых ведаў застаюцца прадметам дыскусій беларускіх вучоных. Тым не менш сёння культуралогія займае пэўнае месца ў агульнай сістэме ведаў, мае свой прадмет даследавання і канкрэтныя метады. У ёй

***Людміла Канстанцінаўна Кухто****, кандыдат культуралогіі, старшы выкладчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. У 1995 годзе скончыла Беларускі педагагічны універсітэт імя М.Танка. Працавала настаўніцай у Пятровіцкай сярэдняй школе, потым вучылася ў аспірантуры БДПУ.*

*Апублікавала больш за 20 артыкулаў.*

*Сфера навуковых інтарэсаў — механізмы сацыякультурнай рэгуляцыі дэмаграфічных паводзін суб'ектаў посткатастрофнага соцыуму, дэмаграфічная палітыка дзяржавы.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сфарміраваліся галіны культуралагічных ведаў: гісторыя культуры, гісторыя культурных тэорый, філасофія культуры, тэорыя культуры, сацыялогія культуры, эканоміка культуры, культурная антрапалогія, культураметрыя і інш.

На наш погляд, у наяўнасці ўсе перадумовы існавання культуралогіі як самастойнай галіны пазнання. Па-першае, у нашай краіне існуе тэзаўрус айчынных, перакладных і іншамоўных тэкстаў, звязаных з вывучэннем культуры. На гэтай базе можна не толькі ідэнтыфікаваць адпаведныя тэксты, але і правесці адрозненне паміж культуралагічнымі і блізкімі да іх тэкстамі, а таксама літаратурай, якая адносіцца да сумежных дысцыплін.

Па-другое, у Беларусі працуюць даследчыкі і выкладчыкі, якія ідэнтыфікуюцца іх асяроддзем і імі самімі як культуролагі. Вядома, кола вучоных з ступенямі доктара і кандыдата культуралогіі ў параўнанні з іншымі краінамі вельмі малое. На сённяшні дзень у Беларусі толькі 3 дактары і 18 кандыдатаў культуралогіі.

Па-трэцяе, у ВНУ ў якасці абавязковага ўведзены вучэбны курс культуралогіі і створаны адпаведныя кафедры, што забяспечвае інстытуцыянальны статус, які пацвярджае яе самастойнасць і аўтаномію ад іншых дысцыплін. Праўда, у большасці з іх гэты прадмет выкладаюць асобы, якія не маюць спецыяльнай адукацыі.

Па-чацвёртае, у юрысдыкцыі Міністэрства культуры знаходзіцца шэраг ВНУ, якія непасрэдна звязаны з вывучэннем культуры. Аднак у іх, акрамя Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, няма ніводнага вучонага са ступенню доктара ці кандыдата культуралогіі. Адсюль вынікае, што ў Беларусі існуе вялікі попыт на спецыялістаў у галіне культуралогіі.

Навука аб культуры зараз можа перайсці да новага якаснага этапу — ад разрозненых апісанняў і дэкларацый да сістэматычнага, у першую чаргу навуковага, пазнання культуры. Думаецца, трэба зрабіць неабходныя захады для інтэнсіўнай падрыхтоўкі культуралагічных кадраў праз аспірантуру і дактарантуру. Стала наяўнай патрэбнасць у стварэнні прафесійнай асацыяцыі і спецыялізаванага культуралагічнага часопіса, што паслужыць інтэнсіфікацыі кантактаў паміж культуролагамі, вылучэнню навукі аб культуры ў асобную галіну пазнання ў межах культуралогіі, фарміраванню больш цесных і сістэматычных сувязей паміж айчыннай і заходняй навукай аб культуры. У Расіі, напрыклад, функцыянуе Навукова-даследчы інстытут культуралогіі.

У асяроддзі даследчыкаў культуры пастаянна ідуць спрэчкі з-за падзелу пазнавальнай тэрыторыі паміж сацыёлагамі, гісторыкамі, філосафамі, мастацтвазнаўцамі. Іх правакуюць сінкрэтызм і ўнутраная неструктураванасць, а навука аб культуры, якая дазваляе правесці больш выразныя пазнавальныя межы, у краіне яшчэ толькі складваецца. Часам і ў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі дысертацыйныя даследаванні, якія абаронены ў саветах па тэорыі і гісторыі культуры, таксама кваліфікуюцца як некультуралагічныя. У сувязі з гэтым трэба было б стварыць самастойны экспертны савет па культуралогіі, што спрыяла б павышэнню якасці навуковых распрацовак і іх аб'ектыўнай ацэнцы.

Сучасная беларуская культуралогія, прадстаўленая выкладчыкамі, спецыялістамі, якія працуюць у даследчых цэнтрах, у сферах кіравання, арганізацыі, кансультавання, не мае дастаткова высокага статуса ў параўнанні з іншымі дысцыплінамі. Як сведчыць практыка, культуролагі аказваюцца няздольнымі да культурна-прафесійнай самаарганізацыі ў сённяшнім беларускім асяроддзі. Думаецца, неабходна дзяржаўнае ўмяшанне, якое стымулявала б развіццё навукі аб культуры. Такая дзейнасць можа ажыццяўляцца на ўзроўнях Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, паколькі ў сферах іх уплыву маюцца неабходныя перадумовы для стымулявання развіцця айчыннай культуралогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ